Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (555) Субота, 22 лютага 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

Старонкі гісторыі

Бяспрыкладны подзвіг

А. В. КІРСАНАЎ,
генерал-маёр у адстаўцы, Герой Савецкага Саюза.

Паспяховае наступленне да Дняпра выклікала вялікае натхненне ў савецкіх войсках. Забыліся і стомленасць ад напружаных баёў, і цяжкасці працяглых пераходаў. Усіх ахапіла імкненне хутчэй гнаць ворага ўсё далей і далей на захад, вызваляючы родную зямлю. Не даць працюніку замацавацца на правым беразе Дняпра, з ходу фарсіраваць гэтую магутную перашкоду, стварыць плацдармы для наступлення на Правабярэжнай Украіне — такая задача стаяла перад савецкімі войскамі. Рашэнню яе былі падпарадкаваны ўсе намаганні савецкіх франтоў, якія наступалі на Левабярэжнай Украіне. Ад войскаў, што ўжо на працягу доўгага часу вялі напружаныя баі, патрабавалася звяршэнне новага вялікага ратнага подзвігу.

Ведаючы, якія вялікія надзеі ускладае нямецка-фашысцкае камандаванне на рубеж Дняпра, Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання яшчэ у пачатку верасня 1943 года указала на неабходнасць фарсіравання яго з ходу і захопу на правым беразе плацдармаў, якія дазволілі б разгарнуць сілы для наступлення на Правабярэжнай Украіне.

Нашы войскі былі ахоплены вялікім наступальным уздымам. Салдаты і афіцэры ясна разумелі, якое рашаючае значэнне для далейшага развіцця Вялікай Айчыннай вайны будзе мець вынік бітвы за Днепр.

У барацьбе за перамогу савецкія воіны дзейнічалі з вялікім напружаннем усіх сваіх фізічных і маральных сіл. Тылы наступаўшых войскаў адсталі, чыгункі былі разбураны адыходзіўшым праціўнікам, аўтатранспарту не хапала. Але, нягледзячы на вялікія цяжкасці, салдаты і афіцэры гарэлі адным жаданнем — хутчэй пераадолець Днепр, уступіць на яго правы бераг.

Вялізную работу ў тыя рашаючыя дні праводзілі палітычныя органы і партыйныя арганізацыі наступаўшых франтоў, рыхтуючы войскі да фарсіравання Дняпра. Усё трэба было падпарадкаваць рашэнню гэтай галоўнай задачы. Трэба было, не чакаючы прыбыцця пантонаў і іншых пераправачных сродкаў, выкарыстоўваць для фарсіравання ўсё, што трапіць пад руку: лодкі рыбакоў, бярвенне, пустыя бочкі і да т. п. Трэба было выкарыстаць раптоўнасць — вялікую ўмову перамогі на Дняпры.

Ідэя смелага і імклівага фарсіравання праходзіла чырвонай ніткай праз усю партыйна-палітычную работу. Воінам растлумачвалася, што толькі імклівае пераадоленне Дняпра і захоп плацдармаў на правым беразе стварыць умовы для выгнання ворага і яго поўнага разгрому.

Насельніцтва Прыдняпроўя радасна сустракала часці Чырвонай Арміі. Перад адступленнем за Днепр гітлераўцы пад пагрозай расстрэлу прымушалі мясцовых жыхароў знішчаць лодкі, каб іх не маглі выкарыстаць савецкія войскі. Але насельніцтва захавала і перадала савецкім войскам сотні лодак.

Старыя рыбакі ўказвалі зручныя месцы для пераправы, браліся правесці лодкі на другі бераг. Усё насельніцтва вызваленых раёнаў Прыдняпроўя дзейсна дапамагала войскам рыхтавацца да фарсіравання.

Савецкія войскі, падыйшоўшы да Дняпра на шырокім фронце, з ходу пачалі фарсіраваць яго адначасова на многіх участках. Фарсіраванне пачалося пад знакам найвялікшага ўздыму і энтузіязму. Салдаты і афіцэры дзейнічалі ініцыятыўна, рашуча, хутка.

Пераправу мы пачалі ў ноч на 28 верасня асобнымі групамі і невялікімі падраздзяленнямі. У іх падбіраліся самыя смелыя, закалённыя ў баях воіны. Да раніцы ў паласе нашай дывізіі за Дняпром аказаліся дзве роты з мінамётамі. І калі днём фашысцкая авіяцыя пачала бамбіць раён пераправы, нашы падраздзяленні, зацапіўшыся за невялікі ўчастак зямлі на правым беразе, стаялі на смерць, адбіваючы ўсе атакі ворага.

У ноч на 29 верасня нам удалося пераправіць яшчэ некалькі рот. Да 1 кастрычніка на плацдарме было ўжо два палкі. Нам удалося ўтрымаць захоплены плацдарм на беларускім беразе Дняпра.

Прыкладна так было і на суседніх участках савецка-германскага фронта ад Лоева да Запарожжа. На правым беразе Дняпра было створана больш дваццаці плацдармаў. Амаль усе яны былі невялікімі, і наперадзе была яшчэ вялікая барацьба за іх расшырэнне.

Днепр як стратэгічны рубеж абароны для ворага быў ужо ў значнай ступені згублены.

Фарсіраванне Дняпра з ходу, пасля цяжкіх наступальных баёў на падручных сродках, не чакаючы накаплівання сіл і прыбыцця цяжкіх пераправачных сродкаў з'яўляла сабой бяспрыкладны ў гісторыі войнаў подзвіг, які рабіўся не асобнымі героямі, а ўсёй масай наступаўшых войскаў. Дзесяткі тысяч воінаў, якія ўдзельнічалі ў фарсіраванні Дняпра, паказалі высокае воінскае майстэрства і беззапаветную вернасць Радзіме. З соцен і тысяч подзвігаў савецкіх людзей выросла вялікая перамога Чырвонай Арміі і на Дняпры. За паспяховае фарсіраванне Дняпра каля двух тысяч салдат, сержантаў, афіцэраў і генералаў усіх родаў войск атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, дзесяткі тысяч узнагароджаны ордэнамі і медалямі. З ліку воінаў нашай дывізіі званне Героя Савецкага Саюза атрымалі 47 чалавек.

★

Былую ўдзельніцу Вялікай Айчыннай вайны Соф'ю Аляксееўну Лысенка на філалагічным факультэце ведаюць усе — студэнты і выкладчыкі, — як строгага і патрабавальнага чалавека, вопытнага педагога, выдатнага знаўцу рускай літаратуры. Дацэнт кафедры рускай літаратуры, Соф'я Аляксееўна Лысенка аддае ўсе свае сілы і намаганні справе выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў-філолагаў.

★

22 гады назад

Восень сорак другога года. Немцы пачалі блакаду партызанскай зоны на Чэрвеньшчыне. Партызаны даведаліся аб задуме карацеляў, але шлях, па якому яны будуць рухацца, быў невядомы. Разведаць гэта было даручана Наталлі Сцяпанаўне Суднік. Разумеючы сваю задачу, яна ўзяла чатырохгадовую дачку Рыту і накіравалася ў Чэрвень.

Справа ў тым, што ў Чэрвені яе ведаў нямецкі камендант. (Немцы спрабавалі прызначыць яе аграномам у адной з гаспадарак). У яго Наталля Сцяпанаўна і рашыла даведацца. Было неяк страшнавата. «Цішэй, цішэй, толькі б усё ўдала было». Суцяшаючы сябе, яна ўвайшла ў кабінет каменданта. І тут, даўшы волю слязам, запыталася, што ёй рабіць, ехаць куды ці не, бо ўсе разбягаюцца, пачуўшы пра наступленне на партызан.

Але немец суцешыў:

— Заставайся на месцы, — буркнуў ён і дадаў: — Яны паедуць у іншым напрамку: з Чэрвеня на...

«Усё ясна. Зараз застаецца толькі паведаміць партызанам»,— падумала Наталля Сцяпанаўна. Увечары ўсё ўжо было вядома ў атрадзе. А раніцай на другі дзень карацелі трапілі на партызанскую засаду і былі разбіты...

Я расказаў толькі адзін факт з гераічнага мінулага гэтай простай і сціплай жанчыны. А колькі іх было ў яе жыцці! Аднак мала хто ведае старонкі з дзённіка ваенных гадоў Наталлі Сцяпанаўны.

Савецкі ўрад высока ацаніў заслугі яе і ўзнагародзіў медалем.

Цяпер студэнты і выкладчыкі біялагічнага факультэта ведаюць яе як добрага выкладчыка, дацэнта кафедры фізіялогіі раслін. Дваццаць пяць гадоў свайго жыцця Наталля Сцяпанаўна Суднік аддала біялагічнаму факультэту. І заўсёды яна карысталася вялікай павагай і аўтарытэтам у калектыве факультэта.

М. ДРОЗД.

ВІТАЕМ!

Кубінскія студэнты, што займаюцца ў БДУ, рады вітаць і павіншаваць Савецкую Армію і Ваенна-Марскі Флот, якія дасягнулі такіх перамог за час свайго існавання! 23 лютага яны адзначаюць сваю 46-ю гадавіну. Мы, кубінцы, чыталі аб подзвігах гэтай Арміі, створанай самім народам, у той перыяд, калі чатырнаццаць імперыялістычных дзяржаў пагражалі маладой Савецкай рэспубліцы. Мы чыталі аб гераічных справах Савецкай Арміі ў барацьбе супраць фашызму ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Залатыя старонкі напісаны Савецкай Арміяй у барацьбе з ворагамі сацыялізма і міру.

Мы захапляемся подзвігам Савецкай Арміі, якая з'яўляецца часткай свайго народу. Яна пераадолела ўсе цяжкасці, якія ствараліворагі міру і сацыялізма, і стаіць на варце, як волат, які ўмее перамагаць і перамагае!

Няхай жыве 46-я гадавіна Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту! Няхай жыве мір ва ўсім свеце!

КУБІНСКІЯ СТУДЭНТЫ.

ПРАВЫ ФЛАНГ

Пасля службы ў арміі яны выбралі адну дарогу. Сустрэліся ў пакоі прыёмнай камісіі БДУ былыя воіны Валянцін Гладышаў, Віктар Леганькоў, Міхаіл Выгоўскі, Мікалай Латыш — авіятар, сувязіст, ракетчык і танкіст. Прывяло ж іх у БДУ адно жаданне: стаць журналістамі. Хлопцы былі далёка не навічкамі ў гэтай справе. У час службы вострае пяро ваенкора было для іх такім жа надзейным сябрам, як і зброя. Але не хапала прафесіянальных ведаў, і хлопцы рашылі: трэба вучыцца.

І вось яны — студэнты. Гэта шмат чаму абавязвае. Цвёрда памятаюць хлопцы наказ, які далі ім камандзіры і таварышы па службе: «Высока трымаць званне салдата, апраўдаць наша давер'е».

Я прыглядаюся да іх, маіх аднакурснікаў. Вось Міша. Гарачы, парывісты, ніколі не ўседзіць на месцы. Прафорг групы, актывіст насценнага друку і ў факультэцкім хоры спявае. А ў вольную хвіліну бярэ ён баян, і льецца песня пра трывожныя салдацкія сны. запальваецца ў цёмных вачах упарты агеньчык. Аб чым думае Міша ў такі час? Я гляджу, як хутка бегаюць яго пальцы і пытаюся: «Міша, чаму ты рашыў стаць журналістам?». Міша некаторы час сядзіць моўчкі. Потым усміхаецца: «Проста люблю, калі вакол жыццё, людзі, люблю ўмешвацца ў жыццё, а не быць пабочным гледачом».

Не быць гледачом. Глыбокі сэнс у гэтых словах. Менавіта таму сядзяць цяпер за студэнцкімі сталамі ўчарашнія салдаты.

Пошта прыносіць лісты. Пішуць з далёкіх гарнізонаў сябры-салдаты. Збіраюцца тады хлопцы разам, чытаюць пісьмо, шлюць адказ. І доўга не змаўкае ў такі вечар размова. Успамінаюць службу, дзеляцца планамі, Ведаюць хлопцы — сэрцам яны і цяпер салдаты, і што б ні здарылася, дапаможа ім салдацкая закалка, заўсёды будуць яны трымаць раўненне на правы фланг.

Л. ДАЙНЕКА,
студэнт 1 курса аддз. журналістыкі.

ВЕРШЫ МАРАКА

Іван ЧЭПА, цяпер студэнт 4 курса гістарычнага факультэта, выдатна нёс службу на флоце. Ён актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці падраздзялення, быў членам літаратурнага аб'яднання. Сёння мы друкуем два вершы І. Чэпы, якія былі напісаны ім у гады службы на флоце.

МОРЮ

И опять пошло волною.
Знаем, ты нам отдыха не дашь.
Нам пришелся по душе задорный
Твой морской характер, как и наш.
Ты, когда бываешь штилевое,
Нам в лицо бросаешь синь волны.
Называем мы тебя — родное,
И в такое сердцем влюблены.
Ширью нас своей приворожило,
Но, вступая в спор, мы каждый раз,
Победив твою большую силу,
Выполняем Родины наказ.

СЛЕЗА

Заглянуло солнце под ресницы,
Улыбнулось девичьим глазам,
А они, как ясные зарницы.
Только почему на них слеза?
Ведь вокруг природа вся ликует,
Мир цветёт, листвою шелестит.
Неужели девушка тоскует,
Неужели девушка грустит?
Разве слёзы только лишь от горя
Наполняют девичьи глаза,
Что безбрежней и синей, чем море?
И от счастья может быть слеза!
Нет. Ничто девчину не печалит.
И её счастливей в мире нет:
Моряка, любимого встречает,
Ведь ждала его уж столько лет!

У НЕБЕ РАДЗІМЫ

Дзень і ноч раўлі авіяцыйныя маторы. Закончыўшы доўгі разбег, цяжка ўзнімаліся ў паветра машыны з грозным бомбавым грузам і, прыняўшы баявы парадак, накіроўваліся на захад. Другія, адбамбіўшыся на пераправах і камунікацыях праціўніка, рабілі заход на пасадку і праз некаторы час стомлена заміралі на месцах стаянак. Некаторыя не вярталіся зусім, многія прыходзілі з прабітымі пласкасцямі і фюзеляжамі, з разбітымі каўпакамі кабін. Бамбардыроўшчыкі неслі сваю суровую і цяжкую службу.

І адну з гэтых грозных машын вадзіў на скапленні ворагаў штурман Рыгор Булацкі і заўсёды дакладна і беспамылкова.

Першыя дні вайны Рыгор Булацкі са сваімі сябрамі сустрэў на Далёкім Усходзе. Там, за далёкай ад іх Волгай ішлі паветраныя баі, савецкія людзі самаадданa змагаліся за кожны метр роднай зямлі, а тут даводзілася сядзець у глухой тайзе, займацца звычайнымі вучэбнымі палётамі і чакаць сваёй чаргі, сцяўшы зубы.

Але вось з чарговай поштай прынеслі газету з артыкулам «Патрыятычны ўчынак Ферапонта Галаватага», і ў Рыгора Булацкага і яго сяброў лётчыка Васіля Ульянава і тэхніка Васіля Школіна з'явілася цудоўная думка: «А што, калі і нам на свае сродкі купіць самалёт і падарыць яго тым, хто змагаецца на фронце?». Неўзабаве паляцела ў Маскву тэлеграма на імя Вярхоўнага Галоўнакамандуючага з просьбай дазволіць выканаць сваю задуму. Адказу не прыйшлося доўга чакаць. А праз некалькі дзён «экіпажу дружных», як называлі сяброў у часці, было загадана выехаць на фронт і ваяваць на ўласным самалёце.

Хутка ішоў час у напружанай вучобе па авалоданню новай машынай. Старанна рыхтаваліся сябры да свайго першага баявога задання.

Чыгуначная станцыя Жмерынка з'яўлялася важным вузлом камунікацый праціўніка, і бамбардыроўшчык, які вёў «экіпаж дружных», узяў курс на цэль. Умела манеўруючы. прарваліся праз шчыльную заслону зенітнага агню, і чорныя фантаны выбухаў выраслі сярод цягнікоў. Заданне было выканана паспяхова.

Дзень за днём, з кожным баявым вылетам расло майстэрства «экіпажа дружных». Хутка самыя складаныя і адказныя заданні даручаліся баявым сябрам. І яны заўсёды вярталіся на аэрадром пераможцамі.

Але аднойчы пры вяртанні дадому пасля ўдалага бомбавага удару варожы знішчальнік пашкодзіў адзін з маторaў самалёта. Толькі да нейтральнай паласы ўдалося «дацягнуць» сябрам на падбітай машыне. Марудна цягнуліся дні ў ваенным шпіталі, неахвотна вярталася здароўе да цяжка параненага штурмана. Нарэшце, ён вярнуўся ў сваю часць. Зноў «экіпаж дружных» разам граміў ворага.

Неўзабаве за выдатнае выкананне баявых заданняў урад узнагародзіў сяброў ордэнамі. Атрымаў ордэн «Чырвоная зорка» і Рыгор Булацкі.

Апошні баявы вылет «экіпаж дружных» зрабіў 9 мая 1945 года. Для Рыгора Булацкага ён быў васьмідзесятым.

Адгрымела вайна. Прайшоў год у мірнай вучобе пад чыстым небам Радзімы. Але старая рана давала сябе адчуваць, і ўлетку 1946 года баявы лётчык Рыгор Булацкі вярнуўся на родную Бабруйшчыну. Але хутка цяга да ведаў прывяла яго ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Непрыкметна прамільгнулі гады карпатлівай вучобы, і ў 1951 годзе ён быў залічаны ў аспірантуру, а праз тры гады выдатна абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Цяпер, узначальваючы філалагічны факультэт нашага ўніверсітэта, Рыгор Васільевіч Булацкі ўсе свае сілы і веды аддае справе падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Ён на самым пярэднім краі барацьбы за выхаванне чалавека новага, камуністычнага грамадства, як і тады, у грозныя дні Вялікай Айчыннай вайны, знаходзіцца ў авангардзе барацьбітоў за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

С. БАРАДОЎСКІ.

Набывайце грамадскія прафесіі!

Факультэт грамадскіх прафесій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна аб'яўляе дадатковы набор на наступныя аддзяленні: **вакальнае; харэаграфічнае; кінафотааматараў; лектарскае; выяўленчага мастацтва; біб іятэчнае;** піянерважатых; хормайстраў.

Тэрмін навучання: на аддзяленні хормайстраў — 4 гады, на аддзяленнях бібліятэчным і піянерважатых — 2 гады, на астатніх аддзяленнях — 3 гады.

Выпускнікам факультэта будуць выдавацца дыпломы.

Заявы на імя дэкана факультэта грамадскіх прафесій прымаюцца штодзённа ў камітэце камсамола.

Пачатак заняткаў — 20 лютага.

САВЕТ ФАКУЛЬТЭТА ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ.

СПОРТ

З сярэдзінкі на палавінку

У Мінску напярэдадні чэмпіяната рэспублікі па канькабежнаму спорту правялі рэспубліканскія спаборніцтвы спартсмены ДСТ «Буравеснік» па праграме круглагадовай спартакіяды. На вялікі жаль, у спаборніцтвах удзельнічалі толькі спартсмены пяці вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі — БПІ, БДУ, Мінскага педінстытута, інстытута замежных моваў, Гомельскага педінстытута.

У камандным заліку перамаглі студэнты палітэхнічнага інстытута, на другім месцы гомельскія канькабежцы. Нашы спартсмены занялі сярэдняе — трэцяе месца.

Не смешна!

У рэктарат БДУ імя У. І. Леніна паступіла такая заява ад дацэнта кафедры тэарэтычнай механікі Івана Рыгоравіча Сеўрука:

«Калі мяне пасялілі ў пакоі студэнцкага інтэрната, мяне не папярэдзілі, што наяўнасць у ёй электрычнай разеткі аўтаматычна цягне павелічэнне платы за пражыванне ў інтэрнаце на 5 руб. (дарэчы, не 5 рублёў, а 4 руб. 80 кап. — Рэд.) кожны месяц. Гэтай разеткай я карыстаюся для галення электрабрытвай, але ўжываемая ёю магутнасць невялікая, усяго 16 вт, што ў пераводзе на грошы складае некалькі кап. у месяц.

Прашу дазволіць мне і наперад карыстацца разеткай для галення, утрымаўшы з мяне кошт карыстання разеткай толькі за адзін месяц пражывання ў інтэрнаце. Гэтай сумы з лішкам хопіць для пакрыцця расходу электраэнергіі на галенне за ўвесь той час, пакуль я пражываю ў студ. інтэрнаце. СЕЎРУК.

8/II—64 г.»

Нічога не скажаш, «сур'ёзная» заява!

Добра пасля лекцый дыхнуць паветрам свежым, заняцца спортам і асабліва гэта падабаецца першакурснікам аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Часта іх можна сустрэць пасля заняткаў у парку на лыжах. Вось і зараз, на гэтым здымку, вы бачыце сябровак пасля лыжнай вылазкі.

Фота М. КРАСУЦКАГА.

ДРУЖНАЯ СЯМ'Я

Я прысутнічаю на экзамене па рускай мове ў групе Зоі Яфімаўны Какошнікавай. Супраць мяне з білетам у руках — Бернарда І дэ Сайяс Францыска, студэнт з гераічнага вострава Свабоды, справа — Кейге Роберт, пасланец з далёкай Канады. Яны ўжо гатовы адказваць. Кенійскі студэнт Поль Кімані і кубінка Чанг Вальдэс Нельса яшчэ працуюць над білетамі. Усе спакойны і ўпэўнены. Адразу відаць, што яны матэрыял ведаюць. Яны ж прыехалі ў нашу краіну вучыцца, іх веды патрэбны іх радзіме! І таму яны не губляюць часу дарэмна.

Францыска чытае тэкст пра маці юнака, які згубіў зрок у баі пад Валгаградам. Добра валодаючы нормамі вымаўлення, Францыска чытае пра подзвіг жанчыны, якая стала рэпетытарам сына. З яе дапамогай сын скончыў вну, аспірантуру і стаў вучоным. Упэўнена, дакладна Францыска аналізуе граматычныя формы, адказвае на дадатковыя пытанні.

— Якая з прачытаных Вамі за апошні час кніг спадабалася больш за ўсё?

— Я зараз чытаю Горкага. Асабліва спадабаўся мне яго нарыс «Уладзімір Ільіч Ленін».

— А Вы маглі б расказаць яго змест?

— Так, магу. Аляксей Максімавіч Горкі стварыў вельмі яркі вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна. Асабліва добра ён піша пра сціпласць Леніна, пра яго чуласць і прастату. «Ленін быў просты, як праўда»... Я запамятаў гэтыя словы.

Нам было вельмі прыемна слухаць такі адказ.

Роберту для чытання трапіўся тэкст «Усюды ёсць сябры» — аб дапамозе венгерскіх патрыётаў савецкім воінам, якія трапілі ў палон да фашыстаў у час вайны.

Правільнае вымаўленне, уменне валодаць граматычнымі формамі пры пераказе тэксту характэрны для адказу Роберта.

— Якую спецыяльнасць Вы атрымаеце ў Савецкім Саюзе? — пытаецца ў яго Зоя Яфімаўна.

— За доўгія гады каланіяльнай залежнасці мая радзіма была даведзена каланізатарамі да жабрацтва. Яны грабілі маю краіну бязлітасна, жорстка. У нас няма прамысловасці. Нашай краіне патрэбна шмат інжынераў, урачоў, настаўнікаў. Але інжынеры патрэбны ў першую чаргу. Нам неабходна будаваць новае жыццё. Мы прыехалі ў вашу краіну вучыцца будаваць фабрыкі, заводы, электрастанцыі. І мы будзем іх будаваць.

— Прывядзіце, калі ласка, прыклады інтэрнацыянальнай дружбы.

— За такімі прыкладамі хадзіць далёка не трэба. У нашай групе вучацца студэнты розных краін, розных рас. Аднак мы жывём дружнай сям'ёй, дапамагаем адзін аднаму. І выкладчыкі ставяцца да нас усіх аднолькава добра, дапамагаюць нам не толькі на занятках, але і пасля заняткаў. Усё гэта і ёсць лепшы прыклад інтэрнацыянальнай дружбы.

Адказ Роберта таксама быў ацэнены выдатнай адзнакай.

М. МЯЦЕЛЬСКІ.

Па слядах нашых выступленняў

„Тры раунды"

У мінулым нумары мы апублікавалі фельетон пад такой назвай. Цяпер рэдакцыя атрымала адказ з хімічнага факультэта: два героі фельетона Б. Мухін і А. Сярмяжка выселены з інтэрната і атрымалі вымовы па камсамольскай лініі.

ЗАЛІК

Апавяданне

Людачка Папкова, студэнтка першага курса хімфака, у соты раз вымярала нервовымі крокамі шырыню ўніверсітэцкага калідора. Час ад часу яна спынялася ля зацягнутага марознымі ўзорамі акна і, прыціснуўшы халодныя далонькі да палаючага апельсінавым агнём твару, ціха шаптала: «Нічога не ведаю, усё пераблыталася. Мамачка! Што ж будзе цяпер, што будзе?..» Яна з усіх сіл старалася не глядзець у той бок, дзе ўсклапочанай чародкай тоўпіліся ля дзвярэй аднакурсніцы. «Які жах!», — рука яе пацягнулася да твару і сцёрла разам з наведзенымі стрэлкамі слёзы.

«Хоць бы Генка хутчэй прыйшоў...». Людачка з тугою паглядзела на свой гадзіннічак. Генка— першае і сур'ёзнае людачкіна каханне — яўна спазняўся. Людачка ўжо некалькі разоў паглядвала ў канец калідора, дарэмна стараючыся ўбачыць яго доўгую фігуру, пакуль нехта, падыйшоўшы непрыкметна ззаду, не прыкрыў ручышчамі яе мокрыя вочы. Ну, канешне ж, гэта быў ён!

Людачка, растроеная і залікам і генкіным спазненнем, даволі рэзка вызвалілася ад нечаканых абдымкаў.

— Пардон, — вінаватым тонам прыступіў да растлумачэння Генка. — Я ляцеў з першай касмічнай...

Ён зрабіў паўзу. І, крыху збянтэжаны яе грабавым маўчаннем, рашыўся вастрасловіць да канца:

— Да таго ж марозік на вуліцы — на старце не заседзішся.

Генка адным пальцам прывычна паправіў свае акуляры і, нясмела ўсміхаючыся, чакаў ад Людачкі прабачэння.

Людачка ж зусім не жадала жартаваць. Яна, гледзячы ў генкіны вочы, адрэзала:

— А Севачка Крахалёў, з якім мы разам учора рыхтаваліся (яна шматзначна падкрэсліла гэтае месца), назначыў мне спатканне, і я ўпэўнена, што нават у пяцідзесяцігрaдусны мароз ён не спазніцца.

— Папкова! — паклікалі раптам. — Твая чарга.

Людачка павярнулася і, громка прастукаўшы абцасікамі, знікла за дзвярыма з надпісам «Хімічная лабараторыя».

«О, жанчыны!..», — пачаў быў пра сябе Генка вядомую шэкспіраўскую фразу, але асекся, зразумеўшы, што сітуацыя зусім не патрабуе яе заканчэння. «Зноў гэты Севачка!», — Генка пабляднеў, твар яго выцягнуўся, ад чаго стаў здавацца плоскім.

Генка, студэнт трэцяга курса фізфака, з першага дня, як убачыў Людачку, лічыў сябе закаханым. І ці ж мог ён уступіць яе Сеўку Крахалёву, гэтаму штангісту без разраду?! «Дарэмна кінуў я займацца ранішняй гімнастыкай, — падумаў Генка. — А Людачка! Каму яна аддала перавагу!».

Генка расшпіліў каўнер: «Канец снежня, а горача, як у тропіках...». Генка не зауважыў, як стаў хадзіць узад і ўперад па калідоры як раз там жа, дзе толькі што хадзіла Людачка.

«М-м-м..», — ледзь быў не прамыкаў Генка. Скрозь сціснутыя да болю зубы нячутна пачулася:

— Ну, я з вамі яшчэ пагавару, Людміла Аляксандраўна! Я вас расшчаплю, як атам, на ўсе вашы састаўныя часткі...

У гэты момант дзверы лабараторыі адчыніліся, і Генка ўбачыў перад сабой Людачку. Вельмі дарэчы з'явіліся яна. Генка спыніўся ў непаразуменні: яе твар ужо не быў злым. Ён палаў, ён свяціўся!

— Гена! — вельмі мілым, ласкавым голасам вымавіла Людачка, ловячы позіркам высушаныя злосцю генкіны вочы. — Генка, ты, пэўна, мяне моцна лаяў, праўда? Я так і падумала, калі пачула, як выкладчык сказаў: «Вам залік».

...На вуліцы свяціла яркае сонца. Снег хрумстаў пад нагамі, адліваў сінявой у сумётах. Генку было прыемна да адказу напаўняць свае лёгкія чыстым калючым паветрам і слухаць Людачку. Трымаючы яго пад руку, яна гаварыла аб тым, з якім задавальненнем сёння ўвечары яна будзе танцаваць толькі з ім, з Генкай.

Выпадковы прахожы, зірнуўшы на пачырванелую на марозе Людачку і на салідны пад лахматым пыжыкам твар Генкі, сказаў: «Шчаслівая пара!».

В. ШЫШКІН,

студэнт 1 курса вячэрняга аддз. журналістыкі.

Рэдактар М. ІОСЬКА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа. АТ 02089 З. 887. Т. 2000.